Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(73), 2012

*УДК 94:355(476+474.5)"1812"*

# Адроджаная прагай да свабоды: армія Вялікага княства Літоўскага 1812 года

С.А. Чаропка

У артыкуле даследуецца працэс адраджэння арміі ВКЛ падчас франка-расійскай вайны 1812 г. Вывучаюцца пытанні механізмаў фарміравання падраздзяленняў, іх колькасны склад, фарміраванне афіцэрскага корпуса. Прасочваецца ўдзел арміі ВКЛ у баявых дзеяннях і лёс яе жаўнераў пасля заканчэння напалеонаўскіх войнаў.
**Ключавыя словы:** франка-расійская вайна 1812 года, Напалеон, армія ВКЛ, бітва каля вёскі Студзёнка, афіцэры арміі ВКЛ, пяхота, уланы, стральцы.

This article explores the process of regeneration of the army of the Great Duchy of Lithuania during the French-Russian war of 1812. It investigates the mechanisms of the formation of the units, their size, staffing of the officer corps. This article examines the participation of the army of the GDL in combat and the fate of its warriors following the end of the Napoleonic wars.
**Keywords:** French-Russian war of 1812, Napoleon, army of Great Duchy of Lithuania, battle of Berezina, Lithuanian army officers, infantry, lancers, riflemen.

Франка-расійская вайна 1812 г. стала, як і многія папярэднія войны ў нашай гісторыі, надзвычай неадназначнай з'явай. Частка жыхароў Беларусі, многія з якіх нарадзіліся яшчэ ў ВКЛ, прагнулі адраджэння Рэчы Паспалітай (РП), неад'емнай часткай якой яны лічылі і беларускія землі ВКЛ. Асабліва актуальным гэта пытанне стала пасля ўтварэння на захопленых прусакамі і аўстрыйцамі падчас трэцяга падзелу землях РП Варшаўскага княства. У патрыятычна настроеных колах былой Кароны і ВКЛ узнікла надзея на адраджэнне польска-літоўскай дзяржавы, многія шляхціцы з Літвы і Беларусі ўцякалі ў адроджаную Польшчу. Шмат былых афіцэраў ВКЛ далучыліся да арміі Варшаўскага княства, сярод якіх былі генерал М. Грабоўскі, камандзір 1 пяхотнага палка; генерал М. Радзівіл, камандзір 5 пяхотнага палка; К. Чартарыйскі, палкоўнік 16 пяхотнага палка; Д.І. Радзівіл, палкоўнік 8 уланскага палка; Я. Вейсенгоф, камандзір 12 пяхотнага палка і іншыя. Многія з іх яшчэ ў 1792 г. абаранялі РП ад расійскіх войск, затым былі ўдзельнікамі паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Іншая частка палітычнай эліты былога ВКЛ, якая знаходзілася на падкантрольных Расіі беларускіх землях, распрацавала праект стварэння аўтаномнага ВКЛ у складзе Расіі, але гэтая ідэя не ажыццявілася [1], [2]. Грамадска-палітычнае жыццё вiравала, таму няма нічога дзіўнага, што з пачаткам франка-расійскай вайны 1812 г. значная шляхта палітычнай эліты былога ВКЛ у спадзяванні на адраджэнне айчыны падтрымала Напалеона.

Вайна 1812 г. на Беларусі не магла застацца па-за ўвагай даследчыкаў. За савецкім часам нешматлікія беларускія даследчыкі звычайна адлюстроўвалі агульнарасійскі падыход да гэтай праблемы, звяртаючы ўвагу пераважна на сацыяльна-эканамічныя аспекты вайны. З набыццём беларускім народам дзяржаўнай незалежнасці ўвага айчынных гісторыкаў стала засяроджвацца менавіта на ролі Беларусі і яе жыхароў у вайне 1812 г., у тым ліку і на тэме стварэння арміі ВКЛ у 1812 г. [2]–[13].

Расійская гістарыяграфія праблемы мае даўнія карані. Яшчэ з 20-х гг. XIX ст. вайна 1812 г. актыўна і шырока даследавалася расійскімі гісторыкамі, але яе асаблівасці для беларускага народа выдзелены не былі. За савецкім часам агульны падыход да ацэнкі вайны не змяніўся. Асноўная ўвага надавалася адлюстраванню змагання беларускага насельніцтва супраць французаў. Пасля распаду СССР расійская гістарыяграфія засталася на старых пазіцыях у адносінах да ролі і месца зямель Беларусі ў падзеях 1812 г., але з'явіліся асобныя работы, якія былі прысвечаны вывучэнню арміі ВКЛ [14]–[18].

Польская гістарыяграфія вайны 1812 года зарадзілася ў пачатку XX ст. і ў цэнтры яе ўвагі апынуліся пераважна сацыяльна-эканамічныя пытанні, праблемы арганізацыі арміі. Су-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

часныя польскія даследчыкі надаюць вялікую ўвагу становішчу на беларускіх землях падчас вайны 1812 г., тэме ваенных фарміраванняў беларускай шляхты і іх ролі ў вайне 1812 г. [19]–[23]. Спробу аналізу шляхоў стварэння арміі ВКЛ зрабілі і літоўскія гісторыкі [24]. Нягледзячы на значны гістарыяграфічны задзел, тым не менш існуе вялізны патэнцыял для далейшага вывучэння абранай тэмы і, перш за ўсё, яе асобных аспектаў.

22 чэрвеня Напалеон выдаў адозву, у якой ён абвясціў аб пачатку “другой польскай вайны”, што не магло пакінуць беларускую шляхту абыякавай [25, с. 14]. 1 ліпеня 1812 г. французскі імператар падпісаў дэкрэт аб стварэнні Камісіі часовага ўрада ВКЛ, фактычна пачаўся працэс аднаўлення дзяржаўнасці ВКЛ. Як у выпадку з Варшаўскім княствам, у склад ВКЛ пераважна увайшлі тэрыторыі, захопленыя Расіяй падчас другога і трэцяга падзелаў РП.

Камісія часовага ўрада станавілася вышэйшым органам цывільнага дзяржаўнага кіравання на тэрыторыі пераўтвораных у дэпартаменты былых Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерній і Беластоцкай акругі. Яна складалася з сямі камітэтаў, кожны з якіх каардынаваў пэўны від дзейнасці. Адным камітэтаў з’яўляўся Ваенны камітэт, які ўзначаліў А. Сапега. Пасля прызначэння 8 ліпеня ваенным губернатарам Літвы Д. Гагендорпа паміж кіраўніком Ваеннага камітэта і новым губернатарам пачаліся супярэчнасці, у выніку якіх А.А. Сапега падаў у адстаўку, а яго на гэтай пасадзе замяніў генерал С. Грабоўскі.

5 ліпеня, падчас уступлення ў Вільню, Напалеон абвясціў аб стварэнні 3 гвардзейскага легкаконнага палка, які часцей называўся 3 Літоўскім палком уланаў Імператарскай гвардыі [19, с. 481]. Полк камплектаваўся валанцёрамі шляхецкага паходжання, а таксама студэнтамі Віленскага ўніверсітэта, ён павінен быў складацца з 5 эскадронаў па 2 роты ў кожным і налічваць 1280 чалавек. У полк залічваліся мужчыны ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў, якія маглі экіпіравацца за ўласны кошт. Да лістапада 1812 г. былі сфарміраваны 4 эскадроны. Камандзірам палка быў прызначаны брыгадны генерал Я. Канопка.

Асабіста для імператара была сфарміравана Пачэсная гвардыя пад камандаваннем Г. Агінскага, якая складалася з маладых прадстаўнікоў найбольш знатных магнацкіх фамілій ВКЛ. Членам гэтай гвардыі стаў брыгадны генерал арміі ВКЛ, ад’ютант пры імператарскім штабе Ю.А. Касакоўскі, ветэран вайны 1792 г. і паўстання 1794 г. [24]

Каля 10 ліпеня было вырашана стварыць армію ВКЛ у складзе 5 пяхотных і 4 кавалерыйскіх палкоў [19, с. 480]. Галоўнай мэтай гэтага войска з’яўлялася ахова шляхоў камунікацый на тэрыторыі дэпартаментаў ВКЛ ад рэйдаў расійскай арміі. Камплектацыя палкоў ВКЛ адрознівалася ад падраздзяленняў Варшаўскага княства. Кожны пяхотны полк мусіў складацца з 3 батальёнаў па 6 рот у кожным, у т. л. 4 роты фузілёрскіх, па адной грэнадзёрскай і вальтыжэрскай. У штат роты ўваходзілі па аднаму капітану, паручніку, падпаручніку, старшаму сяржанту, 4 сяржанты, 1 фур’ер, 8 капралаў, 2 добашы і 95 шараговых, усяго 114 чалавек. Штаб палка складаўся з палкоўніка, маёра палка, 3 шэфаў батальёнаў, 3 ад’ютантаў маёраў, квартэрмайстра, 3 медыкаў, 6 ад’ютантаў падафіцэраў, старшага добаша, 2 капралаў-добашаў, 3 рамеснікаў, усяго 24 чалавек. Штатны склад палка налічваў 66 афіцэраў і 2010 падафіцэраў і шараговых [19, с. 498–499].

Кавалерыйскі полк мусіў складацца з 4 эскадронаў па 2 роты кожным і налічваць 981 жаўнера, з іх 42 афіцэры, 939 падафіцэраў і шараговых. Штатны склад роты быў наступным: 1 капітан, 1 паручнік, 2 падпаручнікі, 1 вахмістр, 4 сяржанты, 1 фур’ер, 8 капралаў, 2 трубачы, 100 шараговых, усяго 120 чалавек. Штаб палка складаўся з палкоўніка, маёра палка, 2 шэфаў эскадронаў, квартэрмайстра, 2 ад’ютантаў маёраў, 3 медыкаў, харужага, 2 ад’ютантаў падафіцэраў, штабовага трубача, 7 рамеснікаў, усяго 21 чалавек [19, с. 499].

Такім чынам, паводле планаў агулам войска ВКЛ павінна было налічваць 14 304 вайскоўца, з якіх у пяхоце – 330 афіцэраў і 10050 падафіцэраў і шараговых, у кавалерыі – 168 афіцэраў і 3756 падафіцэраў і шараговых. На ўзбраенне арміі ВКЛ планавалася выдзеліць 1998 карабінаў і 867 шабель для кожнага пяхотнага палка. На ўзбраенне коннага палка планавалася выдзеліць па 939 шабель, пік і пар пісталетаў [19, с. 499].

Палкі арміі ВКЛ атрымалі нумары, якія працягвалі нумарацыю падраздзяленняў узброеных сіл Варшаўскага княства, г. зн. у пяхоце – з 18 па 22, у кавалерыі – з 17 па 20. Пры гэтым войска ВКЛ не з’яўлялася часткаю польскай арміі. Па лініі ваеннага кіравання армія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ВКЛ падпарадкоўвалася ўласнаму штабу, які быў звязаны непасрэдна з Галоўным штабам “Вялікай арміі”. Па адміністрацыйнай лініі яна падпарадкоўвалася Ваеннаму камітэту. Выключэнне складаў 3 легкаконны полк Я. Канопкі, які арганізацыйна ўваходзіў у склад гвардзейскіх падраздзяленняў французскай арміі.

У канцы жніўня паўстала генеральная інспекцыя арміі ВКЛ. Інспекцыя не была органам камандавання літоўскіх войск, а мэтай яе існавання з’яўлялася дапамога ў арганізацыі арміі. Фармальна інспекцыя падпарадкоўвалася Ваеннаму камітэту, але ў рэальнасці, дзякуючы асабістым сувязям генерала Р. Гедройца, супрацоўнічала з генерал-губернатарам Д. Гогендорпам. Генерал-інспектарам арміі ВКЛ стаў кадравы афіцэр арміі ВКЛ дывізійны генерал князь Рамуальд Гедройц. Генерал-інспектарам пяхоты быў прызначаны брыгадны генерал граф Кс.Ф. Несялоўскі, генерал-інспектарам кавалерыі стаў брыгадны генерал Ю. Ваўжэцкі [13, с. 14].

Праца па стварэнні войска пачалася ўжо з першых дзён ліпеня. 25 ліпеня Ваенны камітэт прыняў пастанову аб наборы з 5 па 30 жніўня на шасцігадовую службу ў пяхоце 10 тысяч кантаністаў з мужчын ва ўзросце 17–34 гадоў. У Віленскім і Мінскім дэпартаментах планавалася сабраць па 3000 чалавек, у Гродзенскім – 2500 чалавек, у Беластоцкім – 1500 чалавек. Загадам ад 13 жніўня вызначаўся прызыў кавалерыстаў. Кожны дэпартамент выстаўляў пэўную колькасць жаўнераў, забяспечыўшы іх коньмі ва ўзросце ад 5 да 8 гадоў або заплаціўшы 500 злотых замест каня. Дэпартаментам даводзіліся наступныя лічбы набору кавалерыі: Віленскі – 1327 чалавек, Гродзенскі – 996, Мінскі – 1307, Беластоцкі – 370, усяго разам 4000 кавалерыстаў [9, с. 106–107].

У выніку праведзенага набору было сфарміравана амаль 6 пяхотных палкоў. У наваколлі Вільні праходзіў працэс фарміравання 18 пяхотнага палка, камандзірам і фактычным мецэнатам якога стаў кадравы афіцэр кароннага войска А. Хадкевіч, які яшчэ ў 1794 г. ваяваў пад сцягамі Т. Касцюшкі. 19 пяхотны полк, які камплектаваўся ў этнічнай Літве, узначаліў К. Тызенгаўз. На чале 20 пяхотнага палка, які фарміраваўся пад Слонімам, камандзірам стаў барон А. Бішпінг. 21 пяхотны полк, які збіраўся пад Беластокам, узначаліў К.Д. Пшэздзецкі, які пазней стаў камандзірам 18 уланскага палка. Замест яго на чале палка стаў А. Гелгуд. 22 пяхотны полк фарміраваўся ў Мінску пад камандаваннем ураджэнца Нясвіжа графа С. Гутэн-Чапскага. 23 пяхотны полк, які не быў запланаваны, сталі камплектаваць вельмі позна і скончыць яго фарміраванне не паспелі.

У выніку набора ў кавалерыю былі сфарміраваны 4 уланскіх палка. 17 полк, які фарміраваўся пад Купішкамі, узначаліў М. Тышкевіч. На чале 18 палка, які збіраўся каля Нясвіжа, стаў першапачаткова Ю. Ваўжэцкі, а пасля яго прызначэння генерал-інспектарам кавалерыі – былы камандзір 21-га пяхотнага палка К.Д. Пшэздзецкі. Камандзірам 19 уланскага палка, сфарміраванага пад Навагрудкам, стаў К. Раецкі, а на чале 20 палка, які камплектаваўся каля Пінска, – Кс. Абуховіч.

Апрача гэтых падраздзяленняў, па 500 кантаністаў з ВКЛ былі прызваны ў 129 лінейны і 2 ілірыйскі палкі французскай арміі. Таксама 8 полк уланаў Варшаўскага княства Д. Радзівіла складаўся ў асноўным з выхадцаў з Беларусі і Літвы [24].

24 жніўня было вырашана ўтварыць дадаткова 6 стралецкіх (егерскіх) батальёнаў па 6 рот. У кожнай роце мусіла быць па 9 афіцэраў і падафіцэраў і 130 шарагоўцаў. Значна пазней, у лістападзе, было вырашана утварыць 2 стралецкіх палка па 3 батальёны ў кожным. Для фарміравання стралецкіх батальёнаў Ваенная камісія вырашыла рэкрутаваць 2/3 усіх ляснікоў ВКЛ. Рэальна былі сфарміраваны 1 батальён Ю.Д. Корвін-Касакоўскага, 2 батальён маёра І. Ракіцкага, 3 батальён маёра К. Плятэра да снежня быў у працэсе фарміравання, а 4 батальён падпалкоўніка А. Курчэўскага ў снежні толькі пачаў збірацца, а апошнія два батальёны так і засталіся на паперы [20, с. 175].

На пачатку жніўня французская адміністрацыя, улічваючы патрыятычны ўздым у ВКЛ, прапанавала імператару павялічыць ваенныя сілы ВКЛ за кошт фарміравання дабраахвотных падраздзяленняў. З ініцыятывай фарміравання новых палкоў выступіў сябра Ваеннага камітэту, колішні ад’ютант славутага Я. Ясінскага А. Пацей. Ён ахвяраваў каля 180 тыс. злотых на фарміраванне 23 пяхотнага палка, які пачаў збірацца ў Мінску. За свой кошт пачаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

фарміраванне кавалерыйскага палка Ігнат Манюшка, які атрымаў назву 21 полк конных стралкоў. Рэальна 21 полк пачаў фарміравацца толькі ў кастрычніку, таму ўкамплектавацца цалкам ён не меў магчымасці. Быў сфарміраваны толькі 1 эскадрон, які налічваў 10 афіцэраў і 258 падафіцэраў і шарагоўцаў [19, с. 563].

У мястэчку Жалудок Лідскага павета ў верасні-кастрычніку за асабісты кошт Р. Тызенгаўза фарміравалася конна-артылерыйская рота, якая налічвала 124 чалавекі і 131 каня і павінна была атрымаць на сваё ўзбраенне 12 гармат [9]. У Расіенскім павеце пачаў арганізацыю кавалерыйскага палка Ю. Гедрайц. У Пінскім павеце падобную спробу зрабіў Г. Яленскі. [19, с. 561]. У верасні пачаў фарміраванне гусарскага палка М. Абрамовіч, але з прычыны недахопу грошай сабраных жаўнераў далучылі да палка конных стралкоў. Галоўнай праблемай у арганізацыі валанцёрскіх палкоў быў недахоп фінансавых сродкаў.

У баку ад грамадска-палітычных падзей на Беларусі не засталося і мясцовае татарскае насельніцтва. Арганізатарамі татарскіх узброеных фарміраванняў сталі былы падпалкоўнік 4 палка пярэдняй варты ВКЛ М.М. Ахматовіч [17], [19, с. 559]. У Навагрудскі, Ашмянскі, Лідскі, Ковенскі, Мінскі паветы, дзе пражывала татарскае насельніцтва, былі разасланы афіцэры, аднак сфарміраваць паспелі толькі адзін эскадрон, які ў якасці выведкі быў далучаны да 3 легкаконнага палка Я. Канопкі.

1 ліпеня 1812 г. Камісія часовага ўрада абвясціла аб стварэнні нацыянальнай гвардыі ў цэнтрах дэпартаментаў і ў гарадах з магдэбургскім правам. Гвардыя прызначалася для аховы межаў ВКЛ, падтрымкі парадку, аховы грамадскай і прыватнай маёмасці, казны дэпартаментаў, а таксама важных ваенных аб'ектаў. Камандзірам віленскай гвардыі прызначаўся палкоўнік Казельскі, яе штаты выглядалі наступным чынам. Планавалася стварыць 2 батальёны па 6 рот у кожным. Кожная рота мусіла налічваць па 3 афіцэры, 14 падафіцэраў, 2 добашы і 100 шараговых, усяго 119 гвардзейцаў. Штаб батальёна складаўся з 6 афіцэраў, 2 падафіцэраў, 3 рамеснікаў і 9 музыкаў, усяго 22 чалавек. Агульны склад нацыянальнай гвардыі мусіў налічваць 1450 чалавек. Усе мужчыны ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў, якія валодалі маёмасцю і не ўступілі ў армію ВКЛ, абавязаны былі служыць у нацыянальнай гвардыі. Узбраенне нацыянальныя гвардзейцы атрымлівалі ад французскіх уладаў, яно было часткова французскім, часткова трафейным [18].

У Гродзенскім дэпартаменце нацыянальная гвардыя складалася з дзвюх рот, якія налічвалі 236 чалавек. 25 верасня гвардзейцы атрымалі 238 трафейных расійскіх стрэльбаў. У Беластоцкім дэпартаменце камендантам гвардыі быў прызначаны палкоўнік Францішак Арсеці. У Мінску працэс арганізацыі гвардзейскіх падраздзяленняў зацягнуўся, але яна ўсё ж была створана, што пацвярджае рапарт С. Грабоўскага аб тым, што "Вільня, Мінск, Беласток і Гародня далёка прасунуліся ў працэсе фарміравання гвардыі" [19, с. 620].

Адначасова з нацыянальнай гвардыяй стваралася і жандармерыя ВКЛ. Яна прызначалася для паліцэйскай службы, барацьбы з бандытызмам і марадзёрствам, аказання ўзброенай дапамогі органам улады. У кожным дэпартаменце прызначаўся камандзір жандармерыі ў чыне палкоўніка, пад камандаваннем якога ў Віленскім і Мінскім дэпартаментах было па 2 эскадронных шэфы, у Гарадзенскім і Беластоцкім дэпартаментах – па аднаму. У кожным павеце стваралася па адной жандарскай роце на чале з капітанам. Штат роты налічваў 5 афіцэраў (2 капітаны, 2 паручнікі, 1 падпаручнік), 21 падафіцэра (1 квартэрмайстар штабавы, 4 квартэрмайстры, 16 брыгадзіраў-сяржантаў), 1 трубача, 80 шараговых, усяго 107 жандараў [19, с. 587]. На чале віленскай жандармерыі быў прызначаны А. Храптавіцкі, беластоцкай – Ф. Арэцці, гродзенскай – М. Радзівіл, мінскай – Л. Аштроп. У выніку было набрана каля дзвюх тысяч чалавек замест запланаваных 3,5 тысяч [18].

Узорам для ўніформы ваяроў арміі ВКЛ былі строі арміі Варшаўскага княства. 3 легкаконны полк насіў форму, падобную да формы жаўнераў 1 гвардзейскага уланскага палка Варшаўскага княства. Яны мелі сінія курткі з малінавым каўнерам, белымі лацканамі і абшлагам. На дзізе быў замацаваны малінава-белы сцяжок. Пехацінцы былі апрануты ў сінюю куртку, белыя летам або сінія зімой штаны. Уланы былі абмундзіраваны ў сінія штаны і куртку і чорнага колеру рагатыўку з белаю бляхаю, на якой, як і ў пехацінцаў, была выява "Пагоні". Стральцы былі апрануты ў зялёную сермягу, суконныя штаны, скураныя боты і

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

шапку. Узбраенне складалася з сякеры і стрэльбы. Татарскія ўланы насілі цёмна-зялёную кашулю, чырвоную куртку, цёмна-зялёныя штаны. На чорным ківеры знаходзілася латунная бляха ў выглядзе шасці- або пяціканцовай зоркі і паўмесяца. На дзідзе мацаваўся сцяжок чырвона-белага або цёмна-зялёнага колеру [9, с. 106–108.]. Уніформа жандараў складалася з сініх штаноў і мундзіра, чорнага ківера і сіняга плашча.

Войскі ВКЛ адыгралі далёка не галоўную ролю у франка-рускай вайне 1812 года, але статыстамі яны таксама не былі. Многія падраздзяленні актыўна ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях. 20 кастрычніка 1812 г. адбыўся першы буйны бой паміж падраздзяленнямі войск ВКЛ і Расіі. Пад Слонімам сустрэліся 3 лёгкаконны полк Я. Канопкі і былога афіцэра арміі ВКЛ, а цяпер расійскага генерала Я. Чапліца. У ходзе бою значная частка асабістага складу палка была знішчана, 247 чалавек, у тым ліку і сам палкоўнік, трапілі ў палон. Цяжкія страты панёс і эскадрон Ахматовіча, які аднак здолеў выйсці з акружэння і адысці да Вільні.

Паспяховае прасоўванне расійскай Дунайскай арміі Чычагова прымусіла армію ВКЛ да згрупіравання. 18, 19, 20 і 21 пяхотныя палкі, 17, 19, 20 уланскія палкі, 21 конна-стралецкі полк, 3 стралецкі батальён і конна-артылерыйская рота сканцэнтраваліся ў Вільні. 1 стралецкі, 22 і частка 23-га пяхотнага палкоў і 18 уланскі полк засяродзіліся ў Мінску пад агульным камандаваннем генерала Ю. Касецкага [23, с. 61]. У сярэдзіне лістапада Ю. Касецкага былі накіраваны пад мястэчка Новы Свержань для абароны пераправаў праз Нёман. Раніцой 18 лістапада літоўскія войскі былі атакаваны пераўзыходзячымі сіламі расійскай арміі пад камандаваннем генерала Ламберта. У выніку бою атрад Касецкага пацярпеў паражэнне, каля 2 тысяч ваяроў патрапілі да няволі, астатнія адышлі да Мінска.

21 лістапада пад Барысавам у бой уступіў 1 стралецкі полк. У перыяд з 26 па 28 лістапада адбыліся найбольш трагічныя для французскай арміі падзеі. Падчас бітвы каля Студзёнкі 18, 19, 20 уланскія палкі прыкрывалі пераправу. 18 уланскі полк адным з першых пераправіўся на правы бераг Бярэзіны. Пасля бітвы каля Студзёнкі асабісты склад 20 уланскага палка напалову зменшыўся. У Бярэзінскай бітве ўдзельнічаў і 22 пяхотны полк С. Чапскага і мінскія жандары. 28 лістапада пад Студзёнкай у бой уступіў ужо “абстраляны” пад Барысавам 1 стралецкі полк Касакоўскага. 28 лістапада мінскі губернатар генерал Бранікоўскі вывеў з горада рэшткі войска, сярод якіх былі часткі 1 стралецкага палка, 22, 23 пяхотных, 18 і 20 уланскіх палкоў [19, с. 657].

Падчас вайны 1812 г. апошні раз было склікана паспалітае рушанне. Пасля Бярэзінскай катастрофы Напалеон даў згоду на скліканне паспалітага рушання ВКЛ [19, с. 654]. Ініцыятыва была несвоечасовая, бо пасля Бярэзінскай катастрофы, ва ўмовах, калі расійскія войскі кантралявалі большасць дыстрыктаў ВКЛ, збор рушання быў малаверагодным.

10 снежня актыўны ўдзел у абароне Вільні ад расійскіх войск прыняла пяхота, кавалерыя, жандармерыя, нацыянальная гвардыя, 3 стралецкі батальён. У выніку баёў за сталіцу амаль поўнасцю быў знішчаны татарскі эскадрон. Пасля выцяснення французскіх войск з беларускіх зямель падраздзяленні арміі ВКЛ адступілі на захад. 18, 20, 21 і рэшткі 22 палка сканцэнтраваліся ў Варшаве. Туды ж накіроўваліся 18 і 20 уланскія палкі, конна-артылерыйская рота, конна-стралецкі эскадрон, 4 стралецкі батальён, падраздзяленні жандараў і нацыянальных гвардзейцаў.

Да Кёнігсбергу адышлі 17 і 19 уланскія палкі пад агульным камандаваннем К. Раецкага. Сюды ж падышлі 19 пяхотны полк, рэшткі 1 стралецкага палка, 3 стралецкі батальён. Хуткім часам пяхота была накіравана да Варшавы для ўмацавання крэпасці Модлін. У Гданьску замацаваліся 20 уланскі полк, які быў уключаны ў склад 9 уланскага палка Варшаўскага герцагства; эскадрон І. Манюшкі быў злучаны з 5 польскім палком конных стральцоў.

17 і 19 уланскія палкі з Кёнігсберга адышлі далей на захад і ў наступным прымалі ўдзел у баях у Германіі. Уначы з 11 на 12 лютага 1813 г. 17 уланскі полк быў атакаваны расійскай арміяй у мястэчку Цырке на Варце. Полк аказаў упартае супраціўленне расійскім войскам, але сам пры гэтым панёс значныя страты. У палон трапіў сам генерал-інспектар арміі ВКЛ Р. Гедройц [26].

У сярэдзіне студзеня 1813 г. 18 і 21 пяхотныя палкі былі далучаны да корпуса Ю. Панятоўскага і ўвайшлі ў склад гарнізона крэпасці Модлін. 20 пяхотны полк фактычна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

быў расфарміраваны, а яго жаўнеры пайшлі на даўкамплектаванне палкоў Варшаўскага княства 8 корпуса Ю. Панятоўскага. З 17 лютага па 25 снежня 1813 г. гарнізон Модліна колькасцю каля 5 тыс. жаўнераў вытрымаў асаду расійскіх войскаў, якія па колькасці пераўзыходзілі абаронцаў у 10 разоў. Крэпасць была здадзена расійскім войскам толькі тады, калі саюзнікі ўступілі на тэрыторыю Францыі, а страты гарнізона склалі амаль 50%. 19 уланскі полк адышоў да Гамбурга і ўвайшоў у склад 13 армейскага корпуса Н. Даву, ваяваў у Гальштэйне і Шлезвігу. 31 сакавіка 1813 г. уланы паспяхова выканалі задачу аховы Напалеона падчас асабістай разведкі імператара. 20 красавіка 1813 г. 19 полк аб'яднаlі з рэшткамі 17 уланскага палка пад парадкавым нумарам апошняга. Гарнізон Гамбурга трымаўся да апошняга і здаўся толькі пасля адрачэння Напалеона.

Ваяры арміі ВКЛ змагаліся ўпарта і самаахвярна. Многія з іх у 1812–1813 гг. атрымалі вышэйшыя ваенныя ўзнагароды РП і Францыі. Так, камандзір 22 пяхотнага палка С. Чапскі пасля бітвы каля Бярэзіны ў 1812 г. стаў кавалерам ордэна Virtuti Militari, а ў 1813 г. атрымаў ордэн Пачэснага Легіёна. Камандзір 1 стралецкага палка Ю. Касакоўскі пасля ўдзелу ў абароне Шпандаў і ў 1813 г. таксама стаў кавалерам ордэна Пачэснага Легіёна.

Лёс войска ВКЛ аказаўся не настолькі трагічным, як гэтага можна было чакаць. 24 сакавіка 1814 г. Аляксандр I прыняў групу магнатаў і шляхты былой РП і дараваў ім падтрымку Напалеона. 17 красавіка 1814 г. у Сен-Дэні Аляксандр I прымаў парад польскага корпуса, у якім сярод іншых былі рэшткі 20 уланскага палка. У наступным гэты корпус увайшоў у склад арміі Каралеўства Польскага. 29 верасня 1814 г. польскія войскі ганарова ўвайшлі ў Варшаву, трохі пазней да іх далучыўся 17 уланскі полк. Пасля таго як у 1818 г. скончыўся 6-гадовы тэрмін службы, жаўнеры апошняга войска ВКЛ вярнуліся дадому [9].

Многія з афіцэраў войска ВКЛ у далейшым працягнулі службу ў арміі Каралеўства Польскага як аўтаномнага дзяржаўнага ўтварэння ў складзе Расійскай імперыі. Генерал-інспектар арміі ВКЛ, генерал дывізіі Р. Гедройц увайшоў у склад Ваеннага камітэту Каралеўства Польскага. Генерал-інспектар пяхоты граф Ф.К. Несялоўскі быў прызначаны камандзірам брыгады, А. Хадкевіч у званні палкоўніка быў прызначаны камандзірам штабу гвардыі Каралеўства, Я. Канопка стаў камандзірам 1 брыгады кавалерыі, але не здолеў уступіць на пасаду з прычыны хваробы і хуткай смерці.

Нягледзячы на тое, што сваёй барацьбой у перыяд з 1795 да 1814 г. патрыятычна настроеная шляхта РП шмат чаго дамаглася – аўтаномнага статуса для Польшчы, увядзення Канстытуцыі і г. д., але мараў аб адраджэнні страчанай у 1795 г. Айчыны многія не пазбавіліся. Калі ў 1830 г. распачалося Лістападаўскае паўстанне, шмат хто з афіцэраў войска ВКЛ стаў пад штандары незалежнасці. Ф.К. Несялоўскі, К.Д. Пшэздзецкі, А. Гелгуд, С. Чапскі ўпарта змагаліся ў шэрагах інсургентаў за адраджэнне РП, звязваючы будучыню беларускіх зямель толькі з гэтай краінай.

**Літаратура**

1. Антонаў, В.В. Агінскага план 1811 / В.В. Антонаў, С.С. Рудовіч, В.В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 31–32.

2. Лукашевич, А.М. Проекты восстановления Речи Посполитой и Великого княжества Литовского и их место в военно-стратегическом планировании Российской империи (1810–1812 гг.) / А.М. Лукашевич [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.museum.ru/1812/Library/Lukashevich/index.html.

3. Корнейчик, Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года / Е. Корнейчик. – Минск : Наука и техника, 1978. – 267 с.

4. Ружанец, А. Літоўска-беларускае войска цэсара Напалеона / А. Ружанец // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 29–30.

5. Таляронак, С. Апошняя армія ВКЛ (1812–1814) / С. Таляронак, А. Блінец // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 2. – С. 22–34.

6. Лукашэвіч, А. Ваеннае становішча ў Беларусі ў 1812 г. / А. Лукашэвіч [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.jivebelarus.net/history/gistografia/war-situation-in-belarus-at-1812.html.

7. Швед, В.В. Фарміраванне і дзейнасць арміі ВКЛ (1812–1815 гг.) / В.В. Швед // Веснік Брэсцкага дзярж. ун-та. – 2000. – № 1. – С. 49–57.

8. Швед, В. Вялікае княства Літоўскае ў 1812 годзе / В. Швед // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 9–15.

9. Швед, В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна, 2006. – 252 с.

10. Ерашэвіч, А.У. Уплыў напалеонаўскіх войнаў на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі (1799–1815 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А.У. Ерашэвіч ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2003. – 21 с.

11. Філатава, А. Вайна 1812 г. і Беларусь / А. Філатава // Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 75–86.

12. Крывіцкая, К.В. Прафранцузскія настроі насельніцтва Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай воласці напярэдадні вайны 1812 года / К.В. Крывіцкая // Весці БДУ. – 2006. – № 3(49). – С. 34–37.

13. Крывіцкая, К.В. Арганізацыя ўзброеных сіл Вялікага княства Літоўскага ў перыяд вайны 1812 года / К.В. Крывіцкая // Весці БДУ. – 2007. – № 1(51). – С. 12–15.

14. Орловский, Е.Ф. Гродненская губерния в 1812 году. Ист. очерк / Е.Ф. Орловский. – Гродно : губернская типография, 1912. – 50 с.

15. Тарле, Е.В. Нашествие Наполеона на Россию, 1812 год / Е.В. Тарле. – М. : Наука, 1992. – 304 с.

16. Жилин, П.А. Гибель наполеоновской армии в России / П.А. Жилин. – М. : Наука, 1974. – 451 с.

17. Шереметьев, О.В. Литовские татары в составе Императорской гвардии Наполеона / О.В. Шереметьев [Электронный ресурс]. – Режим доступа : www.august-1914.ru/sheremetev.pdf.

18. Кудряшов, И.Ю. Вооруженные силы Литовского княжества 1812 года / И.Ю. Кудряшов. – М., 1991. – 19 с.

19. Nawrot, D. Litwa i Napoleon w 1812 roku / D. Nawrot. – Katowice : wyd. Uniwersitetu Slanskiego, 2008. – 790 s.

20. Nawrot, D. Bataliony strzelców na Litwie w 1812 r. / D. Nawrot // Wschodni rocznik humanistzczny. – 2005. – T II. – S. 169–190.

21. Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce / M. Kukiel. – Kraków : nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.

22. Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziłów równorzędnych od r. 1717 do r. 1831 / B. Gembarzewski. – Warszawa nakładem tow. wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s.

23. Staszewski, J. Generał Dominik Dziewanowski / J. Staszewski. – Poznan : członkami druk. wydaw. w Kaliszu, 1933. – 80 s.

24. Gaidis, H.L. Napoleon's Lithuanian forces / H.L. Gaidis // Lithuanian quarterly journal of arts and sciences [Electronic resource]. – 1984. – Vol. 30, № 1. – Mode of access : http://www.lituanus.org/1984_1/84_1_01.htm.

25. Staszewski, J. Pamiętnik Piotra Łagowskiego o wojnie 1812 r. na Litwie / J. Staszewski. – Wilno : drukarnia artystyczna «Grafika», 1936. – 38 s.

26. Журнал военных действий с 6(18) по 8(20) февраля 1813 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.museum.ru/1812/ War/News_rus/izv167.html.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 14.03.12

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ